# Вымаўленне і правапіс галосных о,э,а

Урок беларускай мовы ў 5 класе

**А. С. Кель,**
настаўнік вышэйшай катэгорыі
СШ № 7 г. Ваўкавыска

**Мэта:** мяркуецца, што да канца ўрока вучні

**будуць ведаць** правапіс галосных о,э,а;

**будуць умець** знаходзіць арфаграмы у словах;

✓ вызначаць націскны склад ў словах, прымяняць арфаграфічнае правіла (правільна пісаць словы з літарамі о,э,а);

✓ вылучаць словы іншамоўнага паходжання і словы са спалучэннем літар ро, ло, у якіх не пад націскам пішацца ы (запамінаць словы, якія не падпарадкоўваюцца правілу);

✓ ужываць словы ў вусным і пісьмовым маўленні.

**Задачы:**

спрыяць развіццю ўменняў працаваць з рознымі інфармацыйнымі крыніцамі; карыстацца асабістым вопытам падчас абмеркавання праблемнага пытання, выказваць і аргументаваць сваё меркаванне, рабіць высновы;

удасканальваць камунікатыўныя ўменні, неабходныя для работы ў школьным калектыве;

сродкамі зместу ўрока, яго матэрыялам падтрымліваць цікавасць да роднага слова, выхоўваць грамадзянскасць, патрыятычныя пачуцці гонару за Радзіму, свой народ.

**Тып урока:** камбінаваны.

**Тэхналогія:**поўнага засваення ведаў.

**Метады навучання:** камунікатыўны, наглядны, практычны.

**Міжпрадметныя сувязі:** беларуская літаратура.

**Абсталяванне:** аформленая дошка, наглядны матэрыял, лісты з дыдактычным матэрыялам, рабочы сшытак С.І.Цыбульскай на друкаванай аснове, вучэбны дапаможнік “Беларуская мова”(5 клас, ч.2, 2019).

## Ход урока

Словы – гэта гукі,
А пісьмо – грунт.

Прыказка

**I.Арганізацыйна-матывацыйны этап.**

- Я заўважаю парадак на рабочых месцах, а па вашых вачах магу зрабіць вывад: вы ўсе падрыхтаваліся, рады нашай сустрэчы, і настрой у вас добры. Няхай гэты настрой дапаможа лёгка і радасна працаваць на ўроку.

*Вучні чытаюць па чарзе ўрыўкі з вершаваных твораў, знойдзеных у дадатковых крыніцах.*

*(Творы пра мовы свету. Могуць быць прачытаны і ўласныя творы.)*

1.Вучаць у школе замежныя мовы,
Кожная мова гучыць адмыслова.
Вы паглядзіце – у краіне любой
Ёсць да айчыннага слова любоў.
Шчыра гаворыць француз па-французску,
Рускі прасветлена мовіць па-руску.

2.Піша ад сэрца па-польску паляк.
Як мы да роднае ставімся? Як?
О, загучы, як Радзімы аснова,
Ты, беларуская слынная мова!

3.Англійская мова мне добра даецца,
А да беларускае цягнецца сэрца.
Яе, нібы шчасце, пушчу я ў душу.
-Дзень добры, любімая мова, - кажу.

4.Скажыце, дарослыя, сталыя людзі,
Няўжо нашу родную мову забудзем?
Часцей і паўсюдна на ёй гаварыце,
Багацце яе нам, нашчадкам, дарыце.
Яна, нібы зорачка ранняя, свеціць,
Усім – сталым людзям, дарослым і дзецям.

**II.Матывацыя. Усведамленне тэмы і мэт урока.**

- На зямным шары больш за 3000 моў. І наша родная мова, якую беларускі народ пранёс праз стагоддзі, з’яўляецца найвялікшым нацыянальным скарбам. І гэты скарб ніхто і ніколі адабраць у нас не здолее. Лёс роднай мовы залежыць ад нас. Але каб добра ёю валодаць, спачатку трэба яе вывучыць. І таму сённяшняя наша сустрэча накіравана на далейшае паглыбленне ведаў па беларускай мове.

- “Мова жыве там, дзе ёсць людское жаданне”.

*Зварот да эпіграфа.*

*Сумеснае мэтавызначэнне.*

**III.Інфармацыйна-пошукавы этап.**

**1. *Бліц-апытванне.***

- Графічны знак, які выкарыстоўваецца для абазначэння гукаў мовы. (Літара.)
- Сукупнасць літар, размешчаных ва ўстаноўленым парадку. (Алфавіт.)
- Адзін або некалькі гукаў, якія вымаўляюцца адным штуршком паветра. (Склад.)
- У слове столькі складоў, колькі (галосных гукаў).
- Больш гучнае і працяглае вымаўленне аднаго са складоў слова.(Націск.)
- Для ўдзельнікаў алімпіяднага руху: акут (асноўны націск), гравіс (пабочны націск).

➢ Галосны гук, на які падае націск, і склад з гэтым галосным называецца (націскнымі).

➢ Астатнія галосныя гукі і склады ў слове (ненацісныя).

➢ У беларускай мове галосных гукаў (6).

➢ Для іх абазначэння на пісьме выкарыстоўваюць (10) літар.

***2. Праца з эпіграфам.***

*Пастаўце націск у кожным слове.*

*Падзяліць словы на склады.*

*Пунктуацыйная хвілінка.* Патлумачыць пастаноўку знакаў прыпынку ў сказе. Пабудаваць схему сказа.

***3. Арфаграфічная мазаіка.***

**Заданне:** уставіць прапушчаныя літары, растлумачыць правапіс арфаграм. (Два вучні пішуць на дошцы, а астатнія – на лістах з дыдактычным матэрыялам.)

| | |
|---|---|
| Г_лас – г_ласы. | Р_кі – р_ка. |
| З_лата – з_латы. | Стр_хі – стр_ха. |
| Р_сы – р_са. | Тр_сці – тр_суць. |
| Г_рад – г_рады. | Др_ва – др_ўляны. |
| М_ст – м_сты. | Ш_пт – ш_птаць. |
| Зв_н – зв_ны. | Ш_лест – ш_лясцець. |

***4.Міні-даследаванне.***

а)На дошцы запісаны словы: шніцаль, грэйдар, камп'ютар; Одэр, Юпітэр, Ландэр.

(Вывад: у іншамоўных словах ненаціскныя часткі –аль-, -ар-; у імёнах, прозвішчах, геаграфічных назвах – эр-, -эль-.)

б) Слоўнікавая падборка: дэкада, тэатр, ветэран, ідэал, ордэн, бутэрброд, дэвіз, экзамен, рэцэпт, сальфеджыа, купэ, чэмпіён, тунэль.

(**Вывад:** у пачатку і ў сярэдзіне некаторых іншамоўных слоў не пад націскам вымаўляецца гук /э/, пішацца літара э. Правапіс такіх слоў правяраецца па слоўніку.)

*Выстава слоўнікаў беларускай мовы.*

в) Праверка дамашняга задання (пр.57 на с.28).

**"Карэктар".**

Хрэстаматыя, крашыць (ы), драўляны, інжэнер (ы),кандытар, цана, латэрэя (а),глатаць (ы),

тэхнічны, трыа, трывожны, чарапаха, сальфеджыа, яблык, фламастар.

- Што з вывучанага правіла не патлумачылі?

(**Вывад:** у словах славянскага паходжання і ў словах, даўнозапазычаных з неславянскіх моў, не пад націскам пішацца літара а.)

(**Вывад:** у некаторых словах са спалучэннем літар ро,ло замест о не пад націскам пішацца ы: кроў – крыві. У адпаведнасці з беларускім літаратурным вымаўленнем у некаторых іншамоўных словах пішацца ы: інжынер, трывожны.)

**Заданне:** падабраць аднакаранёвыя словы. Узор:Д**ро**ма – д**ры**мота.

(Адзін вучань піша на дошцы, астатнія – на лістах з дыдактычным матэрыялам.)

1.Кроў -  (крывавы).

2.Дровы – (дрывотня).

3.Брод – (брысці).

4.Глотка – (глытаць).

5.Крошка – (крышыць).

**IV.Фізкультхвілінка.**

**V.Трэніровачна-карэкцыйны этап.**

***1.Праца з тэкстам.***

Янка Купала вельмі любіў Ляўкі за іх асаблівую прыгаж**о**сць.Ён часта х**а**дзіў на бераг Дняпра. Плытаг**о**ны спявалі песні, якія д**о**ўга несліся над в**о**дамі, рэхам адгукаючыся ў б**а**ры.Цэлымі днямі б**о**р нап**а**ўняўся птушыным шчэбетам. Н**о**ччу і раніцай увесь прастор аж дрыжаў ад салаўінага спеву.

*Патлумачыць арфаграмы.*

*Запісаць загаловак.*

*Вызначыць тып тэксту і сродкі сувязі сказаў у тэксце.*

***2.Праца ў сшытках на друкаванай аснове.***

**Вусны пераклад** (**заданне** 107).

Жёлтый, река, чемодан, широкий, жёлудь, корень,чёрствый, серый, жевать, чебурек, передать, шерсть.

(Жоўты, рака, чамадан, шырокі, жолуд, корань, чэрствы, шэры, жаваць, чабурэк, перадаць, шэрсць.)

***3.Праца з урыўкамі з вывучаных твораў па беларускай літаратуры.***

а)У любімай мове, роднай, наскай,
Ах, якія словы: “Калі ласка!..”
Як звіняць яны сардэчнаю струною,
Праз усё жыццё ідуць са мною. *(Пятрусь Броўка “Калі ласка!)*

б)Цябе і заворвалі, і закопвалі,
І ўсё ж нашы продкі праз гора
Данеслі да нас цябе,
Родную, цёплую,
Жывую і непаўторную.*(Яўгенія Янішчыц “Мова”.)*

в)А вакол травіцы роснай рай
І бярозак белая сям’я.
Мой чароўны беларускі край,
Бацькаўшчына светлая мая*! (Уладзімір Караткевіч “Бацькаўшчына”.)*

г)”І ўсе гэтыя тоны спляталіся так гарманічна-своеасабліва ў песні ляснога жаваранка, што яна даходзіла да самых глыбінь сэрца і калыхала самыя тонкія струны душы”. *(Якуб Колас “Песня ляснога жаваранка” (урывак з трылогіі “На ростанях”.)*

д)”Нездарма ў нашай мове я завуся стакротка. Я зноў расту паўсюдна, дзе толькі могуць умацавацца карані, і я хачу, каб бегалі па мне басанож, каб зрывалі мяне і

варажылі на маіх пялёстках шчаслівыя дзеці, хачу радаваць вочы і адаграваць душы дарослых…” *(Андрэй Федарэнка “Падслуханая казка”.)*

*Назваць аўтара і назву твора.*

*Знайсці словы на вывучанае правіла і патлумачыць арфаграмы.*

**VI.Кантрольна-рэфлексійны этап.**

**Заданне** 108 (па варыянтах) у сшытках на друкаванай аснове.

Паставіць націск у кожным слове. Уставіць прапушчаныя літары.

| | |
|---|---|
| Кл _пат – кл _паціцца. | Пр_ста – спр_сціць. |
| Ц_лы – ац_лелы. | Спр_чка – спр_чацца. |
| Прыч_п – ч_пляць. | Прац_джаны – прац_дзіць. |
| Р_зум – р_зумовы. | Ц_гла – ц_гляны. |
| Ж_мчуг – ж_мчужына. | К_лер – к_ляровы. |

- Як вы лічыце, ці справіліся вы з задачамі, пастаўленымі ў пачатку ўрока.

**Вучні ацэньваюць сваю працу па алгарытму “Лесвіца поспеху”:**

Ведаю…

Умею…

Магу…

**VII.Рэфлексія.**

- Сёння вы мелі магчымасць яшчэ раз адчуць і зразумець, што …

*Зварот да эпіграфа.*

“Час працы навучыць большаму, чым дзень тлумачэнняў”.

Шануйце беларускую мову, бо, як сказаў беларускі пісьменнік У.Караткевіч, “хто забыў сваіх продкаў – сябе губляе, хто забыў сваю мову – усё згубіў”.

**VIII.Дамашняезаданне. Каментарый.**

§9, пр.58 на с.28-29; заданне творчага характару(па жаданні).